# СЕКЦЫЯ 7

# 1917 ГОД: РЭГІЯНАЛЬНАЕ ВЫМЯРЭННЕ

**Бароўская Вольга Мікалаеўна**
*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (Мінск, Беларусь)*

## ПОЛЬСКІ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ РУХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1919–1921 ГГ.

Стрыжнем ідэйнай складаючай польскага грамадска-палітычнага руху на тэрыторыі Беларусі была ідэя палітычнай нацыі: усе, хто ўсведамляў сябе «грамадзянамі Краю», належаць да адзінай нацыі незалежна ад этнічнага паходжання і культурнай прыналежнасці. Патрыятызм і любоў да Літвы лічыліся вызначальнымі нацыянальнымі рысамі. У сваёй практычнай дзейнасці краёўцы прызнавалі роўнасць палякаў, беларусаў і літоўцаў як карэнных народаў Беларусі і Літвы. Многія з іх у гэты пералік уключалі таксама і яўрэяў. Па перакананні краёўцаў, усе «грамадзяне» беларускай і літоўскай зямлі павінны былі працаваць на карысць краю. Пад апошнім звычайна разумеліся землі былога ВКЛ, «Край» успрымаўся ў якасці тэрытарыяльнай адзінкі з своеасаблівымі гістарычнымі, культурнымі і гаспадарчымі традыцыямі, спецыфічнай этнічнай структурай. Спецыфіка краю нараджала адметныя краёвыя інтарэсы. Задавальненне гэтых інтарэсаў, на думку краёўцаў, адпавядала найбольш глыбінным патрабаванням усіх народаў краю. Усе элементы краёвага грамадства — літоўцы, беларусы і палякі — успрымаліся як непарыўнае цэлае, нягледзячы нават на тое, што розніліся мовамі. Магчыма, менавіта гэтае пачуццё нараджала перакананне ў неабходнасці палітычнай роўнасці ўсіх карэнных народаў краю. Адметнасць палітычнай дактрыны трымалася на жыццяздольнасці гістарычнай традыцыі, якая спалучалася з ідэяй талеранцыі і перакананння патрэбы добрасуседскага суіснавання этнічна і канфесійна розных грамадскасцей [2].

Яшчэ ў пачатку 1917 г. у Варшаве была створана Літоўская камісія, на аснове якой пазней стварыўся Камітэт аховы крэсаў [3, s. 143]. У адрозненне ад Камітэта аховы крэсаў, Таварыства стражы крэсовай было арыентавана, у першую чаргу, на дзейнасць па заваяванне ініцыятывы ў грамадска-палітычнага жыцця краю. Страж ставіла перад сабой мэтай адраджэння польскага грамадскага, палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця на тэрыторыі так званых «крэсаў» і абапіралася галоўным чынам на працу інструктараў, у задачу якіх уваходзіла стварэнне на месцах польскіх грамадска-гаспадарчых арганізацый — сельскагаспадарчых гурткоў, кааператываў, маладзёвых і культурна-прасветных гурткоў. На тэрыторыі Беларусі Таварыства афіцыйна пачало дзейнасць з 1 сакавіка 1919 г. Адчуваючы падтрымку з боку мясцовай адміністрацыі, Таварыства хутка нарошчвала сваю прысутнасць на тэрыторыі Генеральнага камісарыята, павялічыўшы колькасць інструктараў з 55 чалавек у чэрвені 1919 г. да 114 чалавек у 29 аддзелах на лістапад 1919 г. Толькі да канца 1919 г. Таварыства атрымала на сваю дзейнасць 1,8 млн марак і больш 100 тыс. рублёў ад Грамадзянскага камісарыята і Міністэрства замежных спраў

[4, s. 23]. У кастрычніку 1919 г. па ініцыятыве Таварыства ўзнікае Часовы камітэт узнаўлення ўсходніх зямель. У студзені 1920 г. быў створаны Саюз моладзі Віленскай зямлі, а ў канцы 1919 г. у Мінску ствараецца Таварыства ім. Ю. Пілсудскага [4, s. 42]. Акрамя таго, у 1919 г. толькі ў Мінску дзейнічала польскае таварыства «Сокал», гурток полек, таварыства сяброў навукі і інш. [1, л. 129, 130]. Адным з галоўных накірункаў дзейнасці Таварыства стражы крэсовай была арганізацыя народных рад як прадстаўнічых органаў мясцовага польскага насельніцтва. Польскія рады рознага ўзроўня пачалі ствараца яшчэ ў перыяд нямецкай акупацыі. Ва ўмовах польскай акупацыі народныя рады выбіраліся пад эгідай і пры непасрэдным удзеле Стражы крэсовай у якасці нацыянальных павятовых прадстаўніцтв. Інструктары Стражы крэсовай прыступілі да арганізацыі народных рад летам 1919 г., і ўжо ў сярэдзіне 1919 г. павятовыя сеймікі прашлі ў Гродненскім, Ашмянскім, Лідскім і Ваўкавыскім паветах [8, s. 21].

У кастрычніку 1918 г. у Варшаве быў створаны Камітэт па ўсходніх справах, у які ўвайшлі В. Камянецкі, С. Міцкевіч, А. Бабянскі, а таксама землеўласнікі, згуртаваныя ў Польскай радзе Менскай зямлі: М. Абязерскі, Л. Любенскі, У. Рыбінскі. Камітэт па ўсходніх справах выказваўся за аднаўленне ВКЛ і прызнанне роўных правоў трох гістарычных народаў — палякаў, літоўцаў і беларусаў. Такая пазіцыя грунтавалася на краёвай ідэі, а краёўцы, хоць і выказваліся за аднаўленне ўніі Польшчы з гістарычнай Літвой, ролю Каралеўства Польскага бачылі толькі як падтрымку для рэалізацыі гэтых планаў. Аднак у сувязі з культурнымі, гістарычнымі, палітычнымі і гаспадарчымі адрозненнямі ад цэнтральных польскіх земляў узнікала неабходнасць стварэння ўласных адміністрацыйных улад гістарычных Літвы, якія былі б выбраныя на ўсеагульных выбарах і ўлічвалі б інтарэсы ўсіх этнічных супольнасцей.

На фундаменце краёвай ідэі з’яўляліся розныя канцэпцыі арганізацыі гэтых земляў. Дэмакратычная партыя ў Вільні дамагалася стварэння краёвага ўрада з прадстаўнікамі ўсіх нацыянальнасцей. В. Камянецкі прасоўваў праект утварэння трох кантонаў. Польскі кантон павінен быў ахопліваць Вільню і Троцкі, Гарадзенскі, Лідскі, Ваўкавыскі, Беластоцкі, Бельскі, Сакольскі паветы. У Літоўскі кантон мусілі б трапіць Коўна, а таксама Шаўлі, Цельшы, Тыльзіт, Расейны, Клайпеда і Лібава. Беларускі кантон павінен быў ахапіць паветы Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў, г. зн. заселеныя галоўным чынам праваслаўным насельніцтвам. Такім чынам, праект прадугледжваў падзел беларускага насельніцтва паміж двума кантонамі — польскім і беларускім. В. Камянецкі абдумваў таксама канцэпцыю стварэння пяці аўтаномных адзінак, злучаных федэрацыяй на ўзор швейцарскіх кантонаў з соймамі ў Коўне, Вільні, Беластоку, Менску і Пінску. Гэтая канцэпцыя В. Камянецкага збліжалася з усходнімі планамі І. Падарэўскага, які актыўна цікавіўся будучыняй усходніх земляў.

Надзвычайнай палітычнай актыўнасцю адрознівалася дзейнасць Польская нацыянальная рада беларускіх зямель і Інфлянтаў, якая накіравала зварот 12 студзеня 1920 г. да прэм’ер-міністра Польшчы Л. Скульскага, у якім дакладна прадэманстравала свае асноўныя патрабаванні і праграму ўзаемасупрацоўніцтва з Польскай дзяржавай [6]. Рада настойвала на аўтаномным існаванні тэрыторыі Беларусі ў складзе Польшчы, патрабавала правесці плебісцыт на беларускіх землях, занятых польскімі войскамі, пры

гэтым фінансаванне перадвыбарнай кампаніі ўскладалася на польскую казну, і прапаноўвалася ўключыць прадстаўніка рады ў склад Міністэрства замежных спраў і дапусціць да вырашэння спраў па нармалізацыі адносін з Савецкай Расіяй. Яны жадалі такім чынам выкарыстаць дыпламатычную пляцоўку для рэалізацыі сваіх ідэй. У выніку, падчас барысаўскага этапу савецка-польскіх перагавораў у лютым 1920 г., з ліку Польскай нацыянальнай рады беларускіх зямель і Інфлянтаў у склад польскай дэлегацыі ўвайшоў У. Рачкевіч, намеснік генеральнага камісара ўсходніх зямель і камісар Мінскай акругі [7, s. 3]. Гэты крок быў свайго роду кампрамісам паміж жаданнямі рады і намаганнямі польскага кіраўніцтва па стварэнні «Беларускага П’емонта». Прадстаўніцтва беларускіх зямель на польска-расійска-ўкраінскай канферэнцыі ў Рызе забяспечвалася, дзякуючы намаганням Польскай нацыянальнай рады беларускіх зямель і Інфлянтаў (М. Абезерскі, К. Гардзялкоўскі, В. Васілеўскі). Радай быў накіраваны шэраг пратэстных дэкларацый 12 верасня, 5, 8, 11, 28 кастрычніка, 10 лістапада, 11 снежня 1920 г., у якіх змяшчаліся палітычныя патрабаванні (гарантаванне правоў самавызначэння нацый), вострыя формы пратэсту супраць падзелу беларускіх зямель і патрабаванні забеспячэння нацыянальных, культурна-рэлігійных правоў польскаму мясцоваму насельніцтву ў той частцы, што адыходзіла расійска-ўкраінскаму боку. 9 кастрычніка 1920 г. на адрас польскай мірнай дэлегацыі ў Рызе паступілі пэўныя заўвагі і карэктура ўжо падрыхтаванага тэксту Прэлімінарнага мірнага дагавора, падрыхтаваныя членамі Польскай нацыянальнай рады беларускіх зямель і Інфлянтаў М. Абезерскім і Б. Крыжаноўскім. Пазбаўленыя права ўдзелу ў працы рэдакцыйнай камісіі мірнай канферэнцыі, члены рады, атрымаўшы чарнавы варыянт дагавора, звярталі ўвагу членаў польскай дэлегацыі на праблемныя моманты дагавора, на ўнясенне ў тэкст дагавора пункта, які б прадугледжваў вырашэнне польска-літоўскіх тэрытарыяльных спрэчак без удзелу Савецкай Расіі. Аўтары заўваг настойвалі на прадстаўленні магчымасці рэалізаваць у поўнай меры права на самавызначэнне для беларускіх зямель. Таксама яны звярталі ўвагу членаў польскай дэлегацыі, што адмова Польшчы ад правоў на тэрыторыі, размешчаных на ўсход ад лініі размежавання, у сваю чаргу патрабуе аналагічнай адмовы з савецкага боку. Адначасова М. Абезерскі і Б. Крыжаноўскі раілі ўключыць пункт, які ўдакладняў бы форму ўзаемаадносін паміж БССР і РСФСР («федэратыўныя або якія-небудзь іншыя сувязі») [5, s. 22—24]. Паступілі прапановы па аб’яднанні нясвіжскага майарата (валоданне Караля і Леона Радзівілаў) у рамках аднаго дзяржаўнага ўтварэння. Міністру замежных спраў Польшчы Я. Сапегі быў накіраваны праект пагранічнай лініі, якая б праходзіла ад Мінска па р. Пціч у паўднёвым накірунку, за р. Прыпяць. Такім чынам б у склад Польскай дзяржавы ўваходзілі ўсе землі адзначанага майарата. Аналагічны праект быў перададзены праз У. Рачкевіча міністру ўнутраных спраў (з 24 ліпеня 1920 г. па 29 чэрвеня 1921 г.) Л. Скульскаму і дырэктару палітычнага дэпартамента Міністэрства замежных спраў Польшчы Э. Пілтцу. У гэтым дакуменце звярочвалася ўвага на мэтазгоднасць тэрытарыяльных зменаў. У першую чаргу ўвага засяроджвалася на значных матэрыяльных і маральных унёсках шляхты беларускіх зямель у справу арганізацыі польскіх вайсковых фарміраванняў. Па-другое, прыводзілася сярод іншых прычын неабходнасці рэктыфікацыі пагранічнай лініі, і эканамічная складаючая: «рыжская мяжа праходзіць

выключна па сушы, што патрабуе каля 100 пагранічнікаў па вярсту, у той жа час, як мяжа па рацэ — усяго каля 10» [8].

Краёўцы самі спрыялі развіццю адпаведнай гістарычнай свядомасці, выпрацоўваючы ўласную канцэпцыю мінулага Беларусі і Літвы. Гістарычная памяць і звязаныя з ёю пэўныя псіхалагічныя ўстаноўкі былі часткай унікальнага феномену падвоенай свядомасці тыпу gente Lithuanus (vel Ruthenus) natione Polonus. Палітыка культурнай русіфікацыі і палітычнай дэпаланізацыі, якую праводзілі расійскія ўлады, спрыяла ўмацаванню ў падвоенай свядомасці менавіта «польскага» кампанента. Польска-літоўская ўнія трактавалася краёўцамі як саюз роўных партнёраў. Аднак ва ўмовах падзелу літоўска-беларускага абшару па ўмовам Рыжскага мірнага дагавора, прадстаўнікі польскага грамадска-палітычнага руху вымушаны былі адмовіцца ад сваіх ідэй, адстойваць больш-менш прывабны тэрытарыяльны праект, які ўключаў б уласныя землеўладанні ў склад Польскай дзяржавы.

### Бібліяграфічны спіс

1. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ) – Ф. р-1806. Воп. 1. Спр. 78.

2. Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864–1917 г. / А. Ф. Смалянчук; пад рэд. С. Куль-Сяльверставай. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 322 с.

3. Gierowska-Kallaur, J. Problemy polskich struktur panstwowych na terenie bylego Wielkiego Ksienstwa Litewskiego / J. Gierowska-Kałłaur // Rok 1918. Odrodzona Polska w nowej Europie. – Warszawa: Wydawnictwo Neriton, Instytut Historii PAN, 1999. – S. 137–151.

4. Gierowska-Kallaur, J. Straz Kresowa a Zarzad Cywilny Ziem Wschodnich: Wspoldzialanie czy rywalizacja? / J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa: Wydawnictwo Neriton, Instytut Historii PAN, 1999. – 131 s.

5. Konferencja Ryska a nasza granica wschodnia. — Warszawa, 1920. — 69 s.

6. List Polskiej Rady Narodowej ziem białoruskich do Prezydenta Ministrów 12 stycznia 1920 r. // Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). — Zespół 503. Ambasada Rzeczypospolitej Polskiej w Londynie. Sygn. 426. S. 4—6.

7. Obiezierski, M. Wspomnienia z polsko-rosyjskiej konferencji pokojowej ryskiej / M. Obiezierski. — Warszawa, 1938. — 35 s.

8. Rocznik statystyczny Wilna 1921–1928. – Wilno, 1930. – 510 s.

**Довгялло Михаил Степанович**

*Белорусский государственный университет (Минск, Беларусь)*

## ВКЛАД БЫВШЕЙ РОССИЙСКОЙ ЭМИГРАНТСКОЙ ИНТЕЛЛИГЕНЦИИ В НАУКУ, КУЛЬТУРУ И ПОДГОТОВКУ КАДРОВ (НА ПРИМЕРЕ КОРОЛЕВСТВА СХС)

После поражения Австро-Венгрии в Первой мировой войне представители правительства Сербии, Югославянского комитета и Народного веча пришли к соглашению об объединении всех югославянских земель и создании нового государства. 1 декабря 1918 г. в Белграде сын короля Петра Карагеоргиевича принц-регент Александр провозгласил объединение Сербии с Государством СХС и создание Королевства сербов, хорватов и словенцев (КСХС) [14 с. 12]. Королевство СХС (с 1929 г. Югославия) стало «второй родиной» для